

# Шлях да законнасці праходзіць праз сумленне

*Праблема ўзаемасувязі маралі і права ў выхаваўчай рабоце са старэйшымі падлеткамі*

*І. А. Царык,*
***навуковы супрацоўнік лабараторыі праблем выхавання ў нацыянальнай школе***

**У апошні час з'яўляецца ўсё больш публікацый, прысвечаных маральна-прававому выхаванню. Наяўнасць шырокай грамадскай думкі вакол праблемы падкрэслівае яе ўзрастаючую актуальнасць. Аднак існуе і шэраг работ, дзе ў адпаведнасці з традыцыяй аўтары разглядаюць педагагічную сутнасць або маральнага, або прававога выхавання. Аб адзінстве гэтых кірункаў гаворка ідзе ў публікацыях у асноўным метадычнага характару.**

У галіне ўзаемадзеяння маралі і права праяўляюцца супярэчнасці сацыяльных працэсаў. Дэвальвацыя маральна-прававых каштоўнасцей прывяла да ўзнікнення такой праблемы, як "таксічнасць права", якая заключаецца ў тым, што права можа выклікаць негатыўную рэакцыю людзей, калі юрыдычная норма прымяняецца неабгрунтавана ці не адпавядае патрабаванням маралі. Таму прымяненне права ў выхаванні павінна заўсёды знаходзіцца ў адпаведнасці з маральнымі каштоўнасцямі. Разам з тым толькі маральнае выхаванне не заўсёды дастаткова поўна вызначае сацыяльную арыентацыю асобы. Прававое выхаванне павінна прысутнічаць абавязкова.

**Як паказала наша даследаванне, у прававым выхаванні існуюць супярэчнасці, якія немагчыма вырашаць без новых падыходаў. З аднаго боку, да гэтага часу не ўлічваюцца новыя тэндэнцыі, змены, якія адбываюцца ў развіцці сучаснага грамадства.** Так, тэарэтычнае сцвярджэнне, што мараль і права адзіныя, не заўсёды пацвярджаецца рэчаіснасцю. Напрыклад, школьнік даведаўся пра тайну, якая датычыцца інтымнага жыцця другога чалавека. Права не забараняе распаўсюдзіць яе, але падлетак ведае, што яго дзеянні могуць нанесці камусьці душэўную траўму. Як жа паводзіць сябе, каб не ўступаць у супярэчнасць

ні з правам, ні з мараллю? У сацыяльным жыцці гэтыя праблемы часам прымаюць больш востры характар. Асобныя выказванні дарослых вядуць да ўзнікнення ў школьнікаў дэфармаваных уяўленняў пра законнае і маральнае, справядлівае і мэтазгоднае. На пытанне: "Як вы адносіцеся да таго, што рабочы вынес з завода банку фарбы?" многія (12% апытаных) адказалі, што гэта дробязь, якая не варта асуджэння і кары. Услед за дарослымі яны апраўдваюць такі ўчынак "маральнымі" меркаваннямі — усё роўна валяецца, а чалавеку няма за што купіць...

З другога боку, у педагагічнай тэорыі і практыцы школ да нядаўпяга часу выхаванне разглядалася як сума прыватных працэсаў. Кожны з іх — у тым ліку маральнага і прававога выхавання — вёўся як самастойны, з дапамогай адпаведнай сістэмы форм і метадаў. Так атрымалася неапраўданая спецыялізацыя гэтых узаемазвязаных, непарыўных напрамкаў выхавання. Найважнейшы шлях вырашэння праблем прававога выхавання школьнікаў, безумоўна, у аб'яднанні яго з маральным.

Ідэя заключаецца ў тым, каб маральна-прававое выхаванне фарміравала мараль і правасвядомасць асобы. Сёння такі падыход знаходзіць метадычнае ажыццяўленне ў распрацоўках навучальных курсаў "Грамадазнаўства" і "Чалавек і грамадства". Аднак пакуль што нельга сцвярджаць, што гэта праблема вырашана як у тэарэтычным, так і ў метадычным аспектах. У навуковай літаратуры не адзначаны тыя паняцці, якія належаць да сферы ўзаемапранікнення маралі і права, не вызначаны вядучыя звенні, структураўтваральныя фактары пры даследаванні асаблівасцей і шляхоў маральна-прававога выхавання. Застаецца нявырашаным пытанне, якую ролю адыгрываюць пачуцці, эмоцыі ва ўсведамленні маральна-прававых каштоўнасцей і норм.

На аснове вынікаў нашага даследавання (мы вывучалі адносіны старэйшага падлетка да маральна-прававых каштоўнасцей і патрабаванняў грамадства) і даных сацыялагічных, псіхалагічных і педагагічных прац можна адзначыць абвастрэнне многіх праблем у маральна-прававым станаўленні асобы сучаснага падлетка. Калі ў папярэднія дзесяцігоддзі большасць старэйшых падлеткаў мела магчымасць працаваць на вытворчасці, то цяпер у сувязі з ростам беспрацоўя гэта становіцца фактычна немагчымым. Не маючы законнага права прыкласці свае сілы, падлетак імкнецца знайсці іншыя формы самарэалізацыі. Усё гэта абумоўлівае ўзнікненне так званых зон рызыкі. Акрамя таго, моладзь бачыць шматлікія прыклады атрымання вялікіх грошай непрацоўным шляхам: праз перапродаж, вымаганне, раскраданне і г.д. Такім чынам, у свядомасці пэўнай яе часткі вартасць працы як законнага сродку задавальнення сваіх патрэб становіцца вельмі нізкай.

Расслаенне грамадства адмоўна адбілася на сумленні школьнікаў. Многія нават зайздросцяць тым, хто "ўмее жыць", "умее" парушаць закон і заставацца непакараным.

Другія падлеткі наогул губляюць веру ў паспяховасць барацьбы са злачыннасцю. Так, на пытанне дзевяцікласнікам, што б яны зрабілі, калі б убачылі п'янага, што спіць на вуліцы, і сябар прапанаваў забраць у яго грошы, значная частка падлеткаў (12,8% апытаных) адказала, што не бачыць нічога дрэннага ў гэтай прапанове. Бо, маўляў, п'яніца ўсё роўна іх спусціць на гарэлку. Другая частка апытаных (4,6%) абыякава аднеслася б да гэтага падбухторвання, падкрэсліўшы, што самі яны грошы не ўзялі б, але і сябрам не пярэчылі б. Аб тым, чым абарочваецца падобная абыякавасць да юрыдычных і маральных нормаў жыцця, красамоўна сведчыць дзікае здарэнне, якое адбылося нядаўна ў Гомелі: двое падлеткаў абабралі п'янага, які спаў пад дзвярыма сваёй кватэры, а потым падпалілі яго, і чалавек загінуў.

Сучаснае жыццё не спрыяе фарміраванню пэўных маральных якасцей, а ўзаемасувязь маралі і права ўсведамляецца толькі на вербальным узроўні. Неадпаведнасць прапанаваных маральна-прававых ведаў жыццёваму вопыту з'явілася

прычынай таго, што вучні губляюць веру ў законнасць, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да інфантылізму, сацыяльнай пасіўнасці, цынізму, адсутнасці духоўнасці.

**Нельга не закрануць праблему, якая датычыцца пазаўрочнай выхаваўчай работы.** Раней у школе праводзілася вялікая колькасць мерапрыемстваў, якія не аказвалі рэальнага выхаваўчага ўздзеяння на вучня. Цяпер назіраецца адваротная тэндэнцыя: наогул адмаўляецца ўся пазаўрочная выхаваўчая работа. Аналіз педагагічнай практыкі, праведзены намі за апошні навучальны год, выявіў, што ў планах выхаваўчай работы многіх школ ці адсутнічае накіраванасць на маральна-прававое выхаванне школьнікаў, ці яно здзяйсняецца фармальна.

Анкетным апытаннем устаноўлена, што большасць настаўнікаў, падкрэсліваючы актуальнасць і неабходнасць маральна-прававога выхавання, спасылаюцца на адсутнасць метадычных распрацовак па дадзенаму пытанню. Гэта, безумоўна, ускладняе рэалізацыю працэсу ў практыцы.

**Выяўленыя недахопы ставяць педагагічную навуку перад неабходнасцю далейшай распрацоўкі праблемы маральна-прававога выхавання, вызначэння педагагічна мэтазгодных у сучасных умовах сродкаў фарміравання свядомасці падлетка, які павінен стаць суб'ектам сацыяльнай рэчаіснасці.**

*In the article by I.Tsarik intimate relations of moral and juridical education for students are investigated.*